УДК 338.1

У.А. Кулажанка, д-р экан. навук, прафесар

# СТВАРАЦЬ УМОВЫ ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ

Сярод галоўных умоваў эканамічнага росту, аб'яўленых дзяржавай на бягучы год і перспектыву, выдзяляюць стабілізацыю сельскай гаспадаркі як базавай галіны народнай гаспадаркі і ўдасканаленне размеркавальных адносінаў як на макра-, так і на мікраўзроўні, падпарадкаванне іх задачам росту.

Сапраўды, чаму перадавыя краіны Еўропы і свету так паспяхова развіваюцца? Проста таму, што праблемы вытворчасці харчу надзейна вырашаны. Дзяржава і гаспадарчыя суб'екты могуць, як ім хочацца, рэгуляваць прадуктовыя і фінансавыя плыні па-за межамі сельскай гаспадаркі, скіроўваючы іх на апераджальны прырост і рост эканомікі ў цэлым. Гэта тычыцца дзейнасці прыкладна 95% працоўных рэсурсаў, а 5% (у некаторых краінах і 2,5%) пры падтрымцы дзяржавы паспяхова спраўляюцца з вытворчасцю прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі. У Савецкім Саюзе, дзе ў сельскай гаспадарцы было занята ў сярэднім каля чвэрці працаздольнага насельніцтва, праблема забеспячэння нармальнага ўзнаўлення галоўнага чынніка вытворчасці – рабочай сілы – не была вырашана. Кідаліся з боку ў бок ад асваення цалінных земляў і ўвядзення гаспадарчага падраду да гарантаванай, але досыць нізкай аплаты, а справа не вырашалася. Даводзілася штогод купляць мільёны тонаў збожжа, адцягваючы рэсурсы ад інвестыцый.

Тым больш не вырашалася праблема размеркавання прадукту. Ільвіная доля яго ішла на мэты ваенна-прамысловага комплексу. Грошай на інвестыцыі не хапала. Краіна заставалася без дарог, без сучасных тэхналогій. Рост жыццёвага ўзроўню быў занядбаны. Вынік неўзабаве сказаўся: ВПК з'еў сацыялізм.

Ёсць недахопы эканамічнага росту сёння і ў Беларусі. Шмат прычын, якія проста блакуюць эканамічны прагрэс. Але галоўныя – дзве вышэйназваныя. І канешне, перш за ўсё непераадолены крызіс сельскай гаспадаркі. Людзі пабеглі з вёскі ў горад. З 1990 па 2003 г. колькасць працуючых на палях і фермах скарацілася з 1067,8 тыс. да 473,4 тыс. чалавек. Атрымліваецца, што мы імкліва даганяем індустрыяльна развітыя краіны па колькасці занятых у сельскай гаспадарцы. Але гэтыя «дагонкі» надта абцяжараныя адставаннем. Калгасы і саўгасы ў пазыках, сума якіх дасягнула 2498,8 млрд. рублёў. За апошнія 10 гадоў вытворчасць мяса скарацілася амаль удвая, малака ў 1,5 разу, буйной рагатай жывёлы паменшылася ў 1,8 разу, свіней – у 1,6 разу. Імкліва скарачаецца пагалоўе буйной рагатай жывёлы ў асабістай падсобнай гаспадарцы пенсіянераў, бо іх памочнікі – дзеці і ўнукі пакідаюць вёску. Абязлюдзенне вёскі звязанае з самай нізкай у краіне заработнай платай, амаль спыненнем жыллёвага будаўніцтва.

З усяго відаць, што ратаванне калгасаў і саўгасаў касметычнымі мерамі кшталту ўстанаўлення шэфства прамысловымі прадпрыемствамі, перадачы разваленых гаспадарак фермерам ды іншым прадпрымальнікам не прынясуць жадаемых вынікаў. Так што давядзецца зноў браць гаспадаркі на дзяржаўны фінансавы крук.

Існуе меркаванне, што выцясненне сялянаў з вёскі ёсць наўмыснае дзеянне пэўных колаў супраць беларушчыны, бо вёска стагоддзямі жывіла родную мову, культуру, самабытнасць. Апусцее вёска, і на гарызонце замаячыць поўная асіміляцыя. Пры гэтым мала суцяшае тое, што перасяленне вёскі ў горад свядома ажыццяўляецца дзеля таго, каб давесці колькасць сялян да такога ўзроўню, які потым дазволіць дасягнуць цывілізаванага ўзроўню вытворчасці шляхам поўнай механізацыі і аўтаматызацыі.

Эканамічны рост вызначаецца і практыкай размеркавання створанага прадукту, а больш дакладна зноў створанай вартасці на фонд спажывання і зберажэння. І сёння гэтая форма размеркавання не адпавядае тым задачам, якія ставяцца кіраўніцтвам краіны па

росту вытворчасці. Так, паводле афіцыйных статыстычных даных, інвестыцыі вытворчага прызначэння за апошнія 3 гады не перавышалі 11,3% да ВУП, што вельмі мала. Недастатковасць інвестыцый выяўляецца і пры параўнанні іх аб'ёму з дарэформеным перыядам. Калі памер інвестыцый за 1989 г. прыняць за 100, то ў 1999–2002 гг. яны складалі толькі 54–56%. Значыць, знізіліся амаль удвая. Невыпадкова зношанасць асноўных фондаў у прамысловасці Беларусі дасягнула на дадзены момант 61,4%, а ў асобных галінах, такіх, як чорная металургія (45,7%), харчовая прамысловасць (47,1%), вытворчасць будаўнічых матэрыялаў (56,1%), iзнос яшчэ больш значны. Прыведзеныя лічбы сведчаць, што ў краіне не толькі не растуць асноўныя фонды, але не ажыццяўляецца іх простае замяшчэнне.

У чым прычына гэтай негатыўнай з'явы? Безумоўна, у неадэкватным размеркаванні выпрацаванага грамадскага прадукту на дзве асноўныя часткі: фонд спажывання і фонд зберажэння. Менавіта на гэтыя абставіны звярнуў увагу прэзідэнт краіны А.Р. Лукашэнка на нядаўнім нарадзе сілавікоў. Ён адзначыў, што ў Міністэрстве ўнутраных спраў працуе 1 тыс. чыноўнікаў, а такая раскоша недапушчальная. Прэзідэнт даў даручэнне скараціць колькасць чыноўнікаў. Між тым гэта тычыцца таксама абласнога раздутага апарату і нават раённага. Фактычна кіраўнік краіны даў каманду скарачаць залішняе спажыванне і вызваляць сродкі для капіталаўкладанняў. І гэта зразумела, бо сродкі, што ідуць на ўтрыманне дзяржаўнага апарату, якія ніяк не скарачаецца, войска, міліцыі, – гэта ўсё фонд спажывання.

Як вядома, галоўным механізмам размеркавання створанага прадукту ў грашовай форме з'яўляецца дзяржаўны бюджэт. Так, даходы кансалідаванага бюджэту на 2004 г. складуць 19 трыльёнаў рублёў, ці аж 42,1% ад ВУП. Добра, што размеркаванне даходаў бюджэту мае сацыяльнае накіраванне. Выдаткі на ахову здароўя павялічаныя да 2,11 трыльёнаў рублёў (4,7% ад ВУП), на асвету – да 2,9 трыльёнаў рублёў (6,5% ад ВУП). Але разам з тым застаюцца вельмі вялікімі (264,3 млрд. руб.) выдаткі на ўтрыманне органаў дзяржаўнага кіравання, 695,3 млрд. рублёў будзе выкарыстана на ўтрыманне сілавых структураў. Параўнанне апошняй лічбы з аб'ёмамі фінансавання дзяржаўных капітальных укладанняў (356,7 млрд. руб. ) сведчыць пра многае.

Не на карысць інвестыцыям гаворыць і практыка фарміравання даходнай часткі бюджэту. Было б вельмі добра, каб дамінавалі падатак на прыбытак і падаходны падатак, а яны ў нас складаюць адпаведна 12,4 і 12,2% даходаў бюджэту ці разам узятыя (24,6%) меней за паступленні ад падатку на дабаўленую вартасць (30,2%).

На шляху скарачэння сродкаў, якія ідуць на ўтрыманне дзяржаўнага апарату, ёсць адна вельмі істотная перашкода. Справа ў тым, што праз выплаты чыноўнікам, міліцыі ды вайскоўцам дзяржава падтрымлівае рост сукупнага попыту, без якога рэальны сектар не можа нармальна функцыянаваць. Адсюль вынікае, што дзяржава павінна клапаціцца таксама і аб росце аплаты працы ў рэальным сектары, не забіраючы з гэтай сферы рэсурсы, неабходныя для росту заработнай платы, значыць, аб удасканаленні размеркавання фонду спажывання найперш у сферы рэальнай эканомікі. Трэба зазначыць, што за апошні час назіраецца рост рэальнай заработнай платы, якая дасягнула ў сваім сярэднім значэнні 107 даляраў у месяц. І гэта нядрэнна, тым болей што А.Р. Лукашэнка абвясціў: «Праз якія два гады сярэдняя заработная плата ў краіне дасягне 250 даляраў».

Але пры рашэнні праблемы ўдасканалення заработнай платы дзяржаўныя органы павінны ўлічыць, што адбываецца хоць і невялікая, але рэвальвацыя даляра і рост заработнай платы ў валютным эквіваленце не адпавядае росту рэальнай заработнай платы. Адбываецца таксама і інфляцыя рубля. Апошняя хоць і скарачаецца, але да гэтага часу не пераадолена. За леташні год яна склала звыш 25% на спажывецкім рынку. У гэтых умовах атрымліваецца, што павышэнне заработнай платы, пенсій і стыпендый у значнай ступені толькі кампенсуе страты насельніцтва ад інфляцыі. З гэтай прычыны скарачаецца спажыванне насельніцтвам асноўных каларыйных прадуктаў харчавання. Так, у 2002 г.

спажыванне мяса ў параўнанні з 1990 г. скарацілася да 77,6%, рыбы – да 56,1%, малака – да 71,7%, яек – да 68,9% і цукру – да 68,9%. Трывожным з'яўляецца становішча з беднасцю ў краіне. Па дадзеных за 2001 і 2002 гг., 28,9% насельніцтва мела сярэднедушавы даход, які не перавышаў бюджэт пражытачнага мінімуму. Праўда, апошнім часам лік бедных сем'яў зменшыўся. У 2000 г. болей 40% насельніцтва мела даходы, якія не перавышалі пражытачны мінімум. У сувязі з гэтым клопат дзяржавы трэба скіраваць на рост мінімальных даходаў насельніцтва, удасканаленне цэнаўтварэння, каб павялічыць спажыванне каштоўных прадуктаў харчавання, павысіць жыццёвы ўзровень усіх катэгорый насельніцтва.

Але ёсць адна праблема ў размеркавальных адносінах, якая даўно наспела, толькі чамусьці не вырашаецца. Гаворка ідзе аб павышэнні долі заработнай платы ў кошце і цане выркбленай прадукцыі. Сёння ўдзельная вага заработнай платы ў кошце вырабленай прадукцыі не перавышае 10%. Заўважым, што ў развітых краінах гэтая доля ўдвая большая. Адсюль нізкая плацежаздольнасць насельніцтва, расце аб'ём нерэалізаванай прадукцыі, прадпрыемствы губляюць стымулы нарошчваць вытворчасць. Можна канстатаваць, што сёння павышэнне заработнай платы ў рэальным сектары эканомікі з'яўляецца надзённай задачай. Але ажыццявіць яе можна толькі пры ўмове адначасовага скарачэння матэрыяльных і энергетычных выдаткаў на выраб адзінкі прадукцыі.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што ў краіне для стварэння ўмоваў росту эканомікі трэба неадкладна правесці ўдасканаленне размеркавальных адносінаў як на макра-, так і мікраўзроўні. Размеркаванне даходаў на фонд зберажэння і спажывання павінна быць аптымальным, а заработная плата павялічваць попыт насельніцтва на спажывецкім рынку, а галоўнае – стымуляваць працоўную дзейнасць.